# ВОСЕНЬСКІ КІРМАШ

(17.11.2025)

Напрыканцы другога кастрычніцкага тydня дзверы нашага дзіцячага сада гасцінна расчыніліся для ўсіх ахвотных поўдзельнічаць у “Восеньскім кірмашы”. Народу назбіралася багата: матулі і таты, бабулі і дзядулі, брацікі і сястрычкі прыйшлі падтрымаць маленькіх артыстаў. Выхаванцы усіх груп шпарка танцавалі, гралі на дзіцячых беларускіх народных музычных інструментах, весела вадзілі карагоды, з цікаўнасцю гулялі ў беларускія народныя музычныя гульні, выразна чыталі вершы, адгадвалі загадкі, с захапленнем спявалі дзіцячыя беларускія песні, у якіх адлюстроўваюцца побыт, культура, традыцыі і абрады беларускага народа.



У былыя часы паездка на кірмаш мела для нашых продкаў не толькі практычнае, але і забаўляльнае значэнне. Шырокі і багаты гандаль разгортваўся на плошчах, суправаджаўся вясёлымі гульнямі, выступленнямі артыстаў, тэатральнымі пастаноўкамі і, такім чынам, ператвараўся ў сапраўднае свята. Вось такое свята адбылося і ў нашай дашкольнай установе.



Святочная зала напоўнілася імітаванымі гандлёвымі радамі з хлебабулачнымі вырабамі, гароднінай, а таксама вырабамі беларускіх народных рамёстваў: рушнікамі з льняной тканіны, саматканымі дыванамі, гарлачамі ды збанамі з цэглы і дрэва, лазы, дэкаратыўнымі саламянымі вырабамі.







Напрацягу ўсяго мерапрыкмтсва у зале панавала добразычлівая, цёплая атмасфера, вельмі добры настрой удзельнікаў і гледачоў. Несумненна, гэтаму асабліва спрыялі галоўныя персанажы свята: Лявон з Лявоніхай ды Мядзедзь-Мядзведзіч.

 

Гледзячы на шчаслівыя твары дзяцей і дарослых, якія не хавалі ўсмешку і не скупіліся на дружныя і гучныя апладысменты, разумееш, што у нас атрымалася сапраўжнае народнае свята, якое ўнясе ўклад у скарбонку ўяўленняў нашых выхаванцаў аб беларускай народнай культуры і мастацтве, узбагаціць іх духоўна, умацуе шанаванне свайго рода, павагу да гісторыі і народных традыцый, што стварае аснову выхавання любові да Радзімы.